Установа адукацыі

«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый

Кафедра гісторыка-культурнай спадчыны

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| __________________Д. В. Герасімёнак | ______________Ю. М. Галкоўская |
| «____»______________2022 г. | «_____»___________2022 г. |

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС

ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# МУЗЕІ ЗАМЕЖНЫХ КРАІН

*для спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа*

*і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)*

Складальнік:

І. І. Бамбешка, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны,

кандыдат культуралогіі

Разгледжаны і рэкамендаваны

на пасяджэнні Савета ўніверсітэта «29» лістапада 2022 г.

пратакол № 3

Складальнік:

Бамбешка І. І., *дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі*

Рэцэнзенты:

Я. Л. Краснова, *вядучы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр сістэмнага аналізу і стратэгічных даследавання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат культуралогіі*;

А. В. Пагоцкая, *дэкан факультэта мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства*

**ЗМЕСТ**


1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 4

2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 7

2.1 План-канспект лекцый 7

3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 22

3.1. Тэматыка семінарскіх заняткаў 22

4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ 26

4.1. Заданні для самастойнай работы студэнтаў 26

4.2. Пытанні да экзамену 28

5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 30

5.1. Тэматычны план 30

5.2. Асноўная літаратура 32

5.3. Дадатковая літаратура 32

## 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Пры ўсёй разнастайнасці існуючых за межамі Беларусі музеяў і адрозненнях у арганізацыі музейнай справы ў асобных краінах, абумоўленых асаблівасцямі іх гісторыі, сацыяльна-эканамічным ладам, культурнымі і іншымі традыцыямі, геаграфічным становішчам, у яе развіцці назіраецца шэраг агульных рысаў і устоўлівых тэндэнцый. Тлумачыцца гэта неабходнасцю вырашэння эканамічных і культурных сувязей, інтэнсіфікацыяй турызму, абмену выстаўкамі, а таксама актывізацыяй прафесійных кантактаў музейных работнікаў розных краін. Гэтыя і іншыя абставіны робяць вучэбную дысцыпліну «Музеі замежных краін» надзвычай актуальнай у працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Прадметам вучэбнай дысцыпліны «Музеі замежных краін» з’яўляюцца пытанні арганізацыі музейнай справы ў краінах далёкага і блізкага замежа, гісторыя фарміравання музейных калекцыі, экспазіцый і выставак у найбольш значных музеях розных краін.

Асноўнай мэтай выкладання дысцыпліны з’яўляецца вывучэнне студэнтамі музейных устаноў і практыкі арганізацыі музейнай справы ў краінах далёкага і блізкага замежжа.

Мэтавая накіраванасць вучэбнай дысцыпліны «Музеі замежных краін» прадугледжвае вырашэнне шэрагу задач:

– выявіць асноўныя арганізацыі, якія займаюцца распрацоўкай музейнай праблематыкі на міжнародным ўзроўні;

– прасачыць на канкрэтным гістарычным і сучасным матэрыяле станаўленне і развіццё музеяў замежных краін;

– выявіць асаблівасці арганізацыі музейнай справы і сістэмы аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў замежных краінах;

– вызначыць залежнасць развіцця музеяў ад культурных, палітычных, эканамічных і іншых прычын.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць*:

- асноўныя накірункі музейнай палітыкі замежных краін;
- гісторыю стварэння і сістэму захавання калекцый сусветна вядомых музеяў;
- структуру музейнай сеткі замежных краін;
- нацыянальныя асаблівасці музейнага будаўніцтва;
- ролю музеяў у развіцці культуры замежных краін;
- сучасны стан музеяў і музейнай справы замежных краін.

Студэнты павінны *ўмець*:

– аналізаваць крыніцы і літаратуру па гісторыі музейнага будаўніцтва замежных краін;
– даць характарытыку музейнай сеткі замежных краін;
– аналізаваць вопыт музейнага будаўніцтва замежных краін;
– вызначаць месца і ролю музеяў у развіці сусветнай культуры.

Студэнты павінны авалодаць:

– асноўным паняційным апаратам дысцыпліны;
– навыкамі апісання, аналізу музейных прадметаў, калекцый.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Музеі замежных краін» прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках):

Спецыяльныя кампетэнцыі:

СК – 7 – Аналізаваць сучасны стан музейных установаў Беларусі і замежжа, ацэньваць перспектывы іх далейшага развіцця, у тым ліку сувязі з суб’ектамі турыстычнай індустрыі;

СК – 8 – Выкарыстоўваць сучасныя веды аб культуры і тэндэнцыях яе развіцця ў музейнай, турыстычнай і менеджарскай дзейнасці, ахове культурнай спадчыны, навыкі перадагічнага і аратарскага майстэрства ў яе інтэрпрэтацыі.

Вучэбная дысцыпліна «Музеі замежных краін» цесна звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Гісторыя музейнай справы», «Тэорыя і методыка

музейнай справы», «Гісторыя культуры», «Гісторыя мастацтваў», «Гісторыя архітэктуры», «Усеагульная гісторыя» і інш.

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

- гісторыка-тэматычны падыход;
- тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
- тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
- камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, дыялогі, абмен думкамі і інш.)
- метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыку рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавую, крэдытна-модульную сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Усяго па вучэбнай дысцыпліне «Музеі замежных краін» вучэбным планам прадугледжана 110 гадзін, з іх 52 аўдыторыя гадзіны (32 гадзін – лекцыі, 20– семінарскіх заняткаў). Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 План-канспект лекцый

### *Уводзіны*

Месца вучэбнай дысцыпліны «Музеі замежных краін» у сістэме гуманітарнай адукацыі як базавай па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны. Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме спецыяльных дысцыплін.

Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны. Прадмет і структура вучэбнай дысцыпліны. Крыніцы і Літаратура.

## Раздзел I. Міжнародныя арганізацыі і аб'яднанні ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны

### *Тэма 1. Дзейнасць ЮНЕСКА ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны*

Стварэнне ЮНЕСКА. Структура і функцыі ЮНЕСКА. Роля ЮНЕСКА ў аб'яднанні намаганняў у галіне музейнай дзейнасці і аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Нарматыўныя дакументы ЮНЕСКА. Канвенцыі і рэкамендацыі ў галіне аховы і захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Дзейнасць ЮНЕСКА захаванні і ахове помнікаў у краінах Азіі і Афрыкі, іншых рэгіёнах свету. Цэнтр сусветнай спадчыны. Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Праграмы ЮНЕСКА па ахове матэрыяльнай, нематэрыяльнай і падводнай спадчыны. Праграма «Памяць міру».

Міжнародныя дні, гады, дзесяцігоддзі, гадавіны і памятныя даты, якія адзначаюцца ЮНЕСКА.

Прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь у ЮНЕСКА. Нацыянальная камісія РБ па справах ЮНЕСКА. Супрацоўніцтва РБ і ЮНЕСКА. Ратыфікацыя Рэспублікай Беларусь канфенцый па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Сумесныя праграмы і праекты.

### *Тэма 2. Дзейнасць Міжнароднага савета музеяў (ICOM)*

Перадумовы стварэння міжнародных аб'яднанняў ў галіне музейнай справы. Міжнароднае бюро музеяў і яго дзейнасць.

Гісторыя стварэння ICOM. Структура ICOM. Статут ICOM. Мэты і задачы ICOM. Міжнародныя камітэты ICOM. Роля ICOM у зацвярджэнні музеязнаўства як навукі. Міжнародны камітэт музеалогіі (ICOFOM). Часопіс «Museum».

Беларускі камітэт Міжнароднага савета музеяў і яго дзейнасць.

### *Тэма 3. Праца Еўрапейскага саюза і Савета Еўропы па пытаннях музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны*

Стварэнне Еўрапейскага саюза. Акцыі і дзейнасць Еўрапейскага саюза ў галіне музейнай справы.

Стварэнне Савета Еўропы. Акцыі і дзейнасць Савета Еўропы ў галіне музейнай справы. Еўрапейскі музейны форум. Конкурс «Лепшы еўрапейскі музей года».

## Раздзел ІІ. Музеі Еўропы

### *Тэма 4. Музеі Вялікабрытаніі*

Арганізацыйныя асаблівасці і структура музейнай сеткі ў Вялікабрытаніі. Агульная характарыстыка музейнай сеткі. Прынцыпы каардынацыі музейнай дзейнасці у маштабах краіны. Заканадаўчыя асновы дзейнасці музеяў у Вялікабрытаніі.

Музеі Англіі. Букінгемскі палац. Віндзорскі замак. Палац Хэмптан Корт. Каралеўскі мастацкі збор і яго даступнасць для шырокай публікі. Лонданскі Тауэр. Брытанскі музей. Нацыянальная галерэя. Галерэя Тэйт і яе філіялы. Музей Вікторыі і Альберта. Ваенна-гістарычныя (Імперскі ваенны музей, Музей Каралеўскіх ваенна-паветраных сіл, Нацыянальны музей арміі і інш.) і навукова-тэхнічныя музеі (Музей навукі ў Лондане, Нацыянальны чыгуначны музей, Нацыянальны марскі музей, Музей грамадскага транспарту ў Лондане і інш.). Прыродазнаўчыя музеі (Музей натуральнай гісторыі ў Лондане). Літаратурныя музеі (Дом-музей Чарльза Дзікенса, Музей Шэрлака Холмса, Музей У. Шэкспіра і

інш.). Іншыя музеі Велікабрытаніі (Музей пад адкрытым небам у Бімішы, Музей мадам Цюсо).

Музеі Шатландыі: Нацыянальная галерэя Шатландыі. Нацыянальны музей Шатландыі. Нацыянальная партрэтная галерэя Шатландыі. Нацыянальны музей вайны ў Эдынбургу.

### *Тэма 5. Музеі Францыі*

Агульная характарыстыка развіцця музейнай справы ў краіне. Аналіз музейнай сеткі. Кіраўніцтва музейнай справай у Францыі. Дзейнасць Міністэрства культуры і адукацыі, Дырэкцыі культурнай спадчыны, грамадскіх і прыватных асацыяцый у сферы музейнай справы.

Забеспячэнне кадрамі музеяў Францыі.

Музеі г. Парыжа: Луўр і Версальскі музейны комплекс. Музей сярэдневякоўя (Тэрмы і гатэль Клюні). Музей д'Арсэ. Музей Аранжэры, Музей Радэна, Нацыянальны цэнтр мастацтва і культуры імя Жоржа Пампіду. Музей імпрэсіянізму і іншыя мастацкія музеі. Музей арміі ў Доме Інвалідаў. Гарадо́к навукі і індустрыі ў парку Ла-Вілет. Нацыянальны музей натуральнай гісторыі і інш.

Музеі ў іншых гарадах Францыі.

### *Тэма 6. Музеі Германіі*

Характарыстыка і структура музейнай сеткі Германіі. Дзяржаўнае кіраўніцтва музейнай справай у Германіі. Інвестыцыйная праграма «Культура на новых землях». Ліквідацыя «музеяў-дубляў».

Музеі Берліна: дзяржаўныя музеі на «Востраве музеяў», Берлінская карцінная галерэя, Музей Берлін-Карлсхорст. Актыўны музей фашызму і супраціўлення. Яўрэйскі музей у Берліне. Нямецкі гістарычны музей. Нямецкі тэхнічны музей. Музей прыродазнаўства.

Музеі Дрэздэна: Дзяржаўныя мастацкія зборы Дрэздэна (Галерэя старых майстроў, Галерэя новых майстроў, «Зялёныя скляпенні», збор форфору, Музей

прыкладнога мастацтва, Альберцінум, Гравюрны і нумізматычны кабінеты, фізіка-матэматычны кабінет і інш.).

Музеі Мюнхена: Старая пінакатэка, Новая пінакатэка, Гліптатэка, Баварскі нацыянальны музей. Нямецкі музей дасягненняў прыродазнаўчых навук і тэхнікі (Нямецки музей). Мюнхенскі гарадскі музей і інш.

Музеі Франкфурта-на-Майне і іншых гарадоў Германіі.

### *Тэма 7. Музеі Італіі*

Стан музейнай справы ў краіне. Структура і арганізацыя музейнай сеткі. Дзяржаўная палітыка. Дзейнасць Міністэрства культуры і прыроднай спадчыны.

Музеі Рыма. Ватыканскія музеі, Рымскі нацыянальны музей, Рымская нацыянальая галерэя, Галерэя Баргезэ. Палац і Галерэя Калона. Музей рымскай цывілізацыі.

Музеі Фларэнцыі: галерэя Уфіцы, Палацінская галерэя (галерэя Піці) і сады Баболі, Акадэмічная галерэя, Нацыянальны музей Барджэла, Археалагічны музей.

Музеі Венецыі: Палац дожаў, Палац Ка д’Ора (Галерэя Франкецці), Палац Ка Пезара (Міжнародныя галерэя сучаснага мастацтва і Венецыянаскі музей усходняга мастацтва), Гарадскі музей Карэр.

Музеі ў іншых гарадах Італіі. Нацыянальная пінакатэка ў Балоны. Нацыянальныя галерэя Марке (Урбіна). Вядучыя музеі Мілана (Музей Польдзі-Пеццолі, Пінакатэка Брэра, Пінакатэка Абразіяна). Вядомыя музеі Неапаля (Нацыянальныя музей і галерэя Кападзімонтэ, Нацыянальны археалагічны музей Неапаля). Егіпецкі музей у Турыне і інш.

### *Тэма 8. Музеі Іспаніі*

Спецыфіка фарміравання музейных установ Іспаніі. Арганізацыя і каардынацыя музейнай справы ў Іспаніі. Дзейнасць Міністэрства культуры Іспаніі ў галіне музейнай справы. Агульная характарыстыка музейнай сеткі.

Музеі Мадрыда: Прада, музей Тысен-Барнэміса, Музей мастацтваў каралевы Сафіі, Музей каралеўскай акадэміі прыгожых мастацтваў Сан-

Фернанда, Нацыянальны музей натуральных навук, Марскі музей, Нацыянальны археалагічны музей, Музей Амерыкі і інш. Каларэўскі палац і Эскарыял.

Музеі Барселоны: Нацыянальны музей мастацтва Каталоніі, Музей футбольнага клуба «Барселона», Музей Пікасо і інш.

Музеі Таледа: Дом-музей Эль-Грэка і інш.

Палацавы комплекс Альгамбра, іншыя помнікі і знакавыя месцы Іспаніі.

### *Тэма 9. Музеі Грэцыі*

Каардынацыя музейнай справы ў Грцэцыі. Дзейнасць Міністэрства культуры і адукацыі і іншых міністэрстваў і ведамстваў у галіне музейнай справы. Ведамасная падпарадкаванасць музеяў Грэцыі. Характарыстыка музейнай сеткі.

Музеі і помнікі г. Афіны: Музей Акропаля, Нацыянальны археалагічны музей, Музей Бенакі, Візантыйскі музей, Ваенны музей, Эпіграфічны музей і інш.

Археалагічныя музеі Салонікаў, Дэльфаў, Алімпіі, Іеракліёна і інш. гарадах.

### *Тэма 10. Музеі Нідэрландаў і Бельгіі*

**Музеі Нідэрландаў.** Традыцыі мастацкага збіральніцтва ў Галандыі**.** Спецыфіка музейнага будаўніцтва і арганізацыі музейнай справы. Музейная сетка краіны. Асацыяцыя музеяў Нідэрландаў.

Музеі Амстэрдама: Дзяржаўны музей ці Рэйксмюзеум, Музей Вінсэнта ван Гога, Дом-музей Рэмбранта ван Рэйна, Эрмітаж-Амстэль, Гарадскі музей, Музей Ганны Франк, Музей NEMO і інш.

Музеі Ратэрдама: Музей Бойманса – ван Бёнінгена, Музей натуральнай гісторыі.

Музеі Гаагі: Каралеўская галерэя Маўрыцхёйс, Муніцыпальны музей Гаагі.

Лейдэн. Дзяржаўны музей старажытнасцей ці Лейдэнскі музей і інішыя.

**Музеі Бельгіі.** Музеі Бруселя: Каралеўскія музей прыгожых мастацтваў. Музей музычных інструментаў. Каралеўскі музей прыродазнаўчых навук. Каралеўскі музей арміі і ваеннай гісторыі Бельгіі і інш.

Музеі Антвэрпэна**.** Каралеўскі музей прыгожых мастацтваў. Этнаграфічны музей. Музей Майер ван дэр Берга. Дом-музей П. П. Рубенса і інш.

Музеі Бругe, Льежа і іншых гарадоў.

### *Тэма 11. Музеі краін Скандынавіі (Нарвегія, Швецыя, Фінляндыя, Данія)*

**Музеі Нарвегіі.** Музейная сетка краіны. Музеі Осла: Нацыянальны музей мастацтва, архітэктуры і дызайну, Нарвежская нацыянальная галерэя, Музей караблёў вікіндаў, Музей Э. Мунка, музеі «Фрам» і «Кон-цікі» і інш.

Нарвежскі музей гісторыі культуры (Нарвежскі народны музей) на в. Бюгдэй і інш.

**Музеі Швецыі.** Прынцыпы музейнай палітыкі, арганізацыі музейнай справы і структура музейнай сеткі. Стакгольм: Нацыянальны музей, Стакгольмскі гістарычны музей, Музей арміі. Музей скульптуры – Сад Мілеса, Карабель-музей «Ваза», Скансэн і інш.

**Музеі Фінляндыі**: Нацыянальны музей Фінляндыі, Фінская нацыянальная галерэя, Музей Атэнеўм, Музей сучаснага мастацтва Кіясма, Мастацкі музей Сінебрухава і інш.

Этнаграфічны музей пад адкрытым небам на в. Сеўрасаары.

Музеі ў іншых гарадах Фінляндыі.

**Музеі Даніі**. Прынцыпы арганізацыі музейнай справы. Дзейнасць Міністэрства культуры.

Музеі Капенгагена. Дзяржаўны музей мастацтваў. Нацыянальны музей Даніі. Музей Торвальдсена. Новая Гліптатэка Карлберга, Каралеўскі марскі музей, Музей сучаснага мастацтва «Луізіана» і інш.

Музеі Орхуса: Дагістарычны музей (Музей дагістарычнай Даніі), Музей вікінгаў.

Музей Г. Х. Андэрсена ў г. Одэнс. Музей караблёў вікінгаў у г. Роскілдзе.

### *Тэма 12. Музеі краін Цэнтральнай Еўропы*

**Музеі Аўстрыі.** Разнастайнасць музеяў Аўстрыі. Венскі музей гісторыі мастацтваў. Галерэя Альберціна. Галерэя Бельведэр. Аўстрыйскі музей прыкладнога мастацтва. Музей этналогіі. Музей крыміналістыкі. Музейны квартал у Вене (Музей сучаснага мастацтва фонда Людвіга, Музей Леапольда, Венскі Кунстхале і інш.). Музеі ў іншых гарадах Аўстрыі.

**Музеі Швейцарыі.** Жэнева: Жэнеўскі музей мастацтва і гісторыі, Музей сучаснага мастацтва і інш. Базэль: Базэльскі музей старажытнасцей, Базэльскі мастацкі музей. Цюрых: Швейцарскі нацыянальны музей і інш.

**Музеі Балгарыі.** Сафія. Нацыянальны гістарычны музей. Нацыянальны этнаграфічны музей. Нацыянальная мастацкая галерэя. Нацыянальны царкоўны гісторыка-археалагічны музей і крыпта храма св. Аляксандра Неўскага. Нацыянальны музей натуральнай гісторыі. Нацыянальная галерэя замежнага мастацтва.

**Музеі Польшчы**. Варшава. Каралеўскі замак на Замкавай плошчы. Палаца-паркавыя комплексы ў Варшаве. Нацыянальны музей. Нацыянальны этнаграфічны музей. Археалагічны музей. Музей Войска польскага. Музей Варшавы. Музей Варшаўскага паўстання. Літаратурны музей імя Адама Міцкевіча.

Кракаў. Каралеўскі замак Вавель. Музей Чартарыйскіх. Галерэя сучаснага мастацтва.

Музеі ў Вроцлаве, Лодзі, Познані і інш.

**Музеі Чэхіі.** Прага. Нацыянальны музей. Нацыянальны тэхнічны музей. Ваенна-гістарычны музей. Музей горада Прагі. Музей Альфонса Мухі і інш.

### *Тэма 13. Музеі краін Усходняй Еўропы*

**Музеі Літвы.** Вільнюс. Нацыянальны музей Літвы. Палац вялікіх князёў літоўскіх. Літоўскі мастацкі музей і яго філіялы.

Каунас: Нацыянальны мастацкі музей імя М. К. Чурлёніса. Мемарыяльныя музеі М. К. Чурлёніса ў Друскеніках і Каўнасе.

**Музеі Эстоніі.** Талін: Эстонскі мастацкі музей і яго філіялы. Эстонскі гістарычны музей і яго філіялы. Эстонскі музей пад адкрытым небам. Марскі музей Эстоніі. Эстонскі музей прыкладнога мастацтва і дызайну.

Тарту: Эстонскі нацыянальны музей, Тартускі мастацкі музей, Эстонскі літаратурны музей, Тартускі музей цацак і інш.

**Музеі Латвіі.** Музей замежнага мастацтва. Латвійскі нацыянальны мастацкі музей. Латвійскі этнаграфічны музей. Нацыянальны музей гісторыі Латвіі. Музей гісторыі Рыгі і мараходства. Латвійскі ваенны музей. Музей гісторыі медыцыны імя Паула Страдыньша і інш.

**Музеі Украіны.** Музеі Кіева: Нацыянальны запаведнік «Сафія Кіеўская», Нацыянальны Кіева-Пячэрскі гісторыка-культурны запаведнік. Нацыянальны мастацкі музей Украіны. Нацыянальны музей «Кіеўская карцінная галерэя», Нацыянальны музей мастацтваў імя Багдана і Варвары Ханенка, Нацыянальны навукова-прыродазнаўчы музей НАН Украіны, Нацыянальны музей літаратуры Украіны, нацыянальны музей Тараса Шаўчэнкі. Нацыянальны музей гісторыі Украіны. Музей народнай архітэктуры і побыту Украіны.

Музеі ў іншых гарадах Украіны. Закарпацкі музей народнай архітэктуры і побыту Украіны (Ужгарад), Нацыянальны музей ў Львове імя Андрэя Шэптыцкага. Адэскі археалагічны музей.

**Музеі Расіі**. Гісторыя калекцыяніравання ў Расіі. Першыя рускія музеі. Асноўныя этапы развіцця музейнай справы Расіі. Прынцыпы арганізацыі музейнай справы. Музейная сетка: структура і прынцыпы арганізацыі. Кіраўніцтва музейнай справай. Падпарадкаванасць музеяў.

Музеі Масквы: Дзяржаўны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Маскоўскі Крэмль» і яго складаючыя, Дзяржаўная Траццякоўская галерэя, Дзяржаўны музей выяўленчага мастацтва імя А. С. Пушкіна, Дзяржаўны гістарычны музей і яго філіялы, Дзяржаўны цэнтральны музей сучаснай гісторыі Расіі, Дзяржаўны палітэхнічны музей, літаратурныя музеі Масквы, Цэнтральны музей Узроеных сіл, Музей Перамогі. Музеі у прыгарадах Масквы.

Музеі Санкт-Пецярбурга: Дзяржаўны Эрмітаж, Дзяржаўны рускі музей, Музей антрапалогіі і этнаграфіі імя Пятра Вялікага Расійскай акадэміі навук (Кунсткамера), Расійскі этнаграфічны музей, Дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі, Дзяржаўны музей палітычнай гісторыі Расіі і інш. Музеі у прыгарадах Пецярбурга.

Музеі-запаведнікі РФ: Дзяржаўны Уладзіміра-Суздальскі гісторыка-архітэктурны і мастацкі музей-запаведнік, Дзяржаўны археалагічны музей-запаведнік «Касцёнкі», Дзяржаўны гісторыка-архітэктурны і этнаграфічны музец-запаведнік «Кіжы», Яраслаўскі гісторыка-архітэктурны музей-запаведнік, Гісторыка-этнаграфічны музей-запаведнік «Шушанскае» і інш.

## Раздзел III. Музеі Амерыкі

### *Тэма 14. Музеі краін Паўночнай Амерыкі*

**Музеі Канады.** Музейная сетка Канады. Нацыянальная музейная палітыка. Нацыянальная музейная асацыяцыя. Музейныя аб’яднанні і арганізацыі Канады.

Нацыянальная галерэя Канады (Аттава). Манрэальскі музей прыгожых мастацтваў. Мастацкая галерэя Антарыё (Таронта). Каралеўскі музей Антарыё (Таронта) Музей цывілізацыі (Квебек). Цэнтр паўночнай спадчыны прынца Уэльскага (г. Елоўнайф).

**Музеі ЗША.** Асаблівасці музейнай сеткі і дзяржаўнай палітыкі ў галіне музеязнаўства. Кіраванне музейнай справай.

Вашынгтон: Нацыянальная галерэя мастацтва, Смітсонаўскі інстытут (Музей мастацтваў і прамысловасці, Галерэя мастацтваў Фрыр, Смітсонаўскі нацыянальны заалагічны парк. Нацыянальны музей натуральнай гісторыі, Нацыянальны музей амерыканскай гісторыі, Музей Анакостыі. Нацыянальны музей амерыканскага мастацтва, Нацыянальны музей амерыканскіх індзейцаў, Нацыянальная партрэтная галерэя, Нацыянальны музей авіяцыі і касманаўтыкі і інш.).

Нью-Ёрк: Метраполітэн-музей, Музей сучаснага мастацтва, Калекцыя Фрыка, Музей амерыканскага мастацтва Уітні, Музей Саламона Гугенхейма, Амерыканскі музей натуральнай гісторыі, Яўрэйскі музей, Бруклінскі музей і інш.

Чыкага: Філдаўскі музей натуральнай гісторыі, Чыкагскі інстытут мастацтваў, Музей сучаснага мастацтва, Музей навукі і прамысловасці і інш.

Лос-Анжэлес: Музей натуральнай гісторыі, Музей Гецці і інш.

### *Тэма 15. Музеі краін Лацінскай і Паўднёвай Амерыкі*

**Музеі Мексікі**. **Мехіка.** Нацыянальны музей антрапалогіі. Нацыянальны музей у палацы Чапультэпек. Музей сучаснага мастацтва. Музей натуральнай гісторыі.

**Музеі Кубы. Гавана.** Музей рэвалюцыі Кубы. Нацыянальны музей прыгожых мастацтваў. Дом-музей Эрнэста Хэмінгуэя.

**Музеі Аргенціны.** Буэнас-Айрес Музей прыгожых мастацтваў. Дзяржаўны музей дэкаратыўнага мастацтва. Муніцыпальны музей мастацтваў Хуана Карласа Кастаньіна. Нацыянальны гістарычны музей Аргенціны. Музей натуральных навук імя Бернадзіна Рывадавія і інш.

**Музеі Бразіліі**. **Рыа-дэ-Жанэйра.** Нацыянальны музей. Нацыянальны гістарычны музей. Музей індзейцаў. Нацыянальны музей сучаснага мастацтва. Нацыянальны музей прыгожых мастацтваў. Музей вобразаў несвядомага і інш.

**Музеі іншых краін Лацінскай і Паўднёвай Амерыкі.** Чылійскі музей дакалумбава мастацтва, Музей салідарнасці імя Сальвадора Альендэ, Музей сучаснага мастацтва (**Чылі**, Санцьяга). Нацыянальная мастацкая галерэя, Музей сучаснага мастацтва, Музей рэвалюцыі, Дзіцячы музей (**Венесуэла**, Каракас). Нацыянальны музей Калумбіі, Музей каланіяльнага мастацтва, Дом-музей Сімона Балівара, Манетны двор – Нумізматычная калекцыя Банка Рэспублікі (**Калумбія**, Багота).

## Раздзел IV. Музеі Афрыкі

Спецыфіка музейнай справы на Афрыкаскім кантыненце. Асаблівасць музейных калекцый. Хуткае павелічэнне музеяў у апошняй трэці XX ст.

## *Тэма 16. Музеі Паўночнай Афрыкі*

**Музеі Егіпту.** Каір: Егіпетскі нацыянальны музей, Музей ісламскага мастацтва, Коптскі музей, Дзіцячы музей імя С'юзн Мубарак, Грэка-рымскі музей.

Александрыя: Александрый музей выяўленчага мастацтва. Александрый нацыянальны музей. Грэка-рымскі музей.

Музейныя комплексы ў Эль-Гізе (Музей Гізы), Луксоры (Луксорскі музей і Карнакскі музей пад адкрытым небам).

**Музеі Лівіі.** Трыпалі: Археалагічны музей (Музей Чырвонага замка). Музей натуральнай гісторыі. Этнаграфічны музей. Музей эпіграфікі. Ісламскі музей.

**Музеі Алжыру.** Алжыр: Нацыянальны музей старажытнасцей і ісламскага мастацтва, Нацыянальны музей народнага мастацтва і традыцый, Этнаграфічны музей Бардо, Нацыянальны публічны музей сучаснага мастацтва, Цэнтральны музей арміі.

## **Тэма 17.** ***Музеі Цэнтральнай і Паўднёвай Афрыкі***

**Музеі Нігерыі.** Нацыянальны музей у Лагосе і Джосе.

**Музеі Кеніі.** Найробі: Нацыянальный музей, Чыгуначны музей, Мастацкая галерэя Сорбсі, Гліняная мячэць Кірпарам.

**Музеі Судана.** Хартум: Нацыянальны музей Судана, Музей натуральнай гісторыі, Этнаграфічны музей, Археалагічны музей Судана.

**Музеі *ПАР (Паўднёва-афрыканскай рэспублікі).*** Прэторыя: Нацыянальны культурна-гістарычны музей, Прыродазнаўчы музей Трансвааля, Мастацкі музей Прэторыі.

Кейптаун: Паўднёва-Афрыканскі музей, Нацыянальная мастацкая галерэя і інш.

# **Раздзел V. Музеі Аўстраліі**

### *Тэма 18. Музеі Аўстраліі, Новай Зеландыі і краін Акіяніі*

Асаблівасці гісторыі музейнай справы ў **Аўстраліі**. Фарміраванне музейнай сеткі.

Канбера: Нацыянальны музей Аўстраліі, Аўстраійская нацыянальная галерэя, Аўстралійскі ваенны мемарыял, Музей Антычнасці Аўстралійскага нацыянальнага ўніверсітэта.

Мельбурн: Музей навукі, Музей Вікторыі, Аўстралійскі музей сучаснага мастацтва, Нацыянальная галерэя Вікторыі, Дом капітана Джэймса Кука, Марскі музей.

Сіднэй: Мастацкая галерэя Новага Паўднёвага Уэльса, Аўстралійскі нацыянальны марскі музей, Сіднейскі музей прыкладных мастацтваў і навук, Музей сучаснага мастацтва Аўстраліі інш.

Спецыфіка арганізацыі музейнай справы ў Новай Зеландыі і краінах Акеаніі.

**Новая Зеландыя.** Велінгтон: Нацыянальны музей Тэ Папа Тангарэва. Музей горада Велінгтона і мора. Велінгтон: Мастацкая галерэя Адама Універсітэта Вікторыі. Окленд: Нацыянальны ваенны мемарыял, Мастацкая галерэя.

**Гаваі.** Ганалулу: Музей натуральнай і культурнай гісторыі штата Гаваі («Музей імя Берніс П. Бішоп»). Музей Фіджы (Сува, Фіджы). Нацыянальны музей і мастацкая галерэя Папуа-Новай Гвінеі (Вайгані, Новая Гвінея).

## Раздзел VI. Музеі Азіі

### *Тэма 19. Музеі Пярэдняй (Заходняй) Азіі*

**Музеі Ізраіля.** Іерусалім: помнікі і гістарычныя мясціны Іерусаліма, Музей Ізраіля ў Іерусаліме, Музей гісторыі Іерусаліма ў Башні Давіда, Музей біблейскіх краін, Музей вязняў падполля, Археалагічны музей Ракфелера, Нацыянальны мемарыял Катастрофы і Гераізму «Яд ва-Шэм» і інш.

Тэль-Авіў: Музей Эрэц-Ісраэль (Зямля Ізраіля), Музей яўрэйскай дыяспары, Музей выяўленчых мастацтваў, Музей Арміі абароны Ізраіля.

Хайфа: Нацянальны марскі музей, Ізраільскі нацыянальны музей навукі, тэхналогій і космасу, Музей японскага мастацтва «Цікацін»

**Музеі Турцыі.** Стамбул: Палац Топкапы, Сафійскі сабор, Музей турэцкага і ісламскага мастацтва, Стамбульскі археалагічны музей, Музей Рахмі М. Коча, Дом-музей К. М. Атацюрка.

Анкара: Музей анаталійскіх цівілізацый, Дзяржаўны музей мастацтва і скульптуры, Маўзалей К. М. Атацюрка.

Бодрум: Музей падводнай археалогіі.

Музеі **Лівана** (Нацыянальны музей Бейрута, Археалагічны музей Амерыканскага ўніверсітэта ў Бейруце, Музей шоўку), **Сірыі** (Нацыянальным музей Дамаска, Нацыянальны музей Алепа), **Ірака (**Нацыянальны музей Ірака, Багдадскі музей (музей натуральнай гісторыі), **Афганістана** (Нацыянальны музей Афганістана), **Ірана (**Тэгеран: Іранскі нацыянальны музей, Музей Разы Абасі, Музей дываноў, Музей сучаснага мастацтва, Нацыянальная скарбніца Цэнтральнага банка Ірана. Музеі і помнікі старажытных гарадоў Ірана).

### *Тэма 20. Музеі Усходняй Азіі*

**Музеі Кітая.** Арганізацыя і заканадаўчыя асновы музейнай справы ў Кітаі. Структура музейнай сеткі. Асаблівасці кітайскіх музеяў.

Пекін: Палацавы комплекс «Гугун», Нацыянальны музей Кітая, Кітайскі музей авіяцыі, Мастацкі музей Яньхуан, Цэнтр сучаснага мастацтва UCCA, Геалагічны музей Кітая і інш.

Нанкін: Музей найноўшай кітайскай гісторыі, Музей гісторыі тайпінаў і інш.

Шанхай: Музей навукі і тэхнікі, Шанхайскі музей і інш.

Кітайскі нацыянальны музей чая (Ханчжоў), Грабніца першага імператара дынастыі Цынь і інш.

**Музеі Японіі.** Структура музейнай сеткі. Асаблівасці японскіх музеяў і арганізацыі музейнай справы.

Токіа: Такійскі нацыянальны музей, Нацыянальны цэнтр мастацтваў, Нацыянальны музей сучаснага мастацтва, Нацыянальны музей заходняга

мастацтва, Мастацкі музей Моры, Музей Універсітэта Мэйдзі, Музей імператарскіх калекцый, Музей Эдо-Токіа, Музей банкнот і паштовых марак, Музей грошай грошай Банка Японіі, Чыгуначны музей Тобу і інш.

Кіёта: Імператарскі музей у Кіёта, Кіётскі міжнародны музей мангі, Нацыянальны музей Кіёта. Нацыянальны музей сучаснага мастацтва і інш.

Осака. Нацыянальны музей мастацтваў, Нацыянальны музей этналогіі, Музей усходняй керамікі, Гарадскі музей выяўленчага мастацтва Осакі, Осакскі музей навукі, Осакскі марскі музей і інш.

Мемарыяльны музей міру ў Херасіме і Музей атамнай бомбы ў Нагасакі.

**Музеі Паўднёвай і Паўночнай Карэі.** Сеул: Нацыянальны музей Карэі. Нацыянальны музей сучаснага мастацтва. Нацыянальны фальклорны музей Карэі. Ваенны мемарыял Рэспублікі Карэя, Алімпійскі музей і інш.

Пхеньян: Цэнтральны гістарычны музей Карэі, Музей Карэйскай Рэвалюцыі, Пхеньянскі чыгуначны музей.

### *Тэма 21. Музеі Паўднёвай Азіі*

**Музеі Індыі.** Структура музейнай сеткі. Асаблівасці індыйскіх музеяў і арганізацыі музейнай справы.

Нью-Дэлі: Нацыянальны музей Індыі. Нацыянальны музей Гандзі (Мемарыяльны музей Гандзі), Музей мастацтваў Кіран Надар, Нацыянальны навуковы цэнтр, Мемарыяльны музей і бібліятэка Дж. Нэру і інш.

Калькутта: Індыйскі музей, Мемарыял Вікторыі, Навуковы музей і інш.

Мумбаі: Музей прынца Уэльскага Западнай Андыі і інш.

Хайдарабад: Музей Салар Джанг, Археалагічны музей штата Андхра-Прадэш і інш.

**Музеі Пакістана.** Карачы: Нацыянальны музей Пакістана, Пакістанскі марскі музей, Музей ваенна-паветраных сіл Пакістана.

Ісламабад: Музей Лок Вірса, Нацыянальная мастацкая галерэя, Пакістанскі музей натуральнай гісторыі і інш.

Лахор: Лахорскі музей, Нацыянальны музей навукі і тэхнікі і інш.

Археалагічны музей Махенджа-Дара.

### *Тэма 22. Музеі Паўднёва-Усходняй Азіі*

Музей мастацтва и навукі (**Сінгапур)**. Музей культурнай спадчыны (**Ганконг).** Нацыянальны музей (**Інданэзія,** Джакарта). Нацыянальны музей **Філіпін** (Філіпіны, Маніла). Нацыянальны музей Бангкока **(Тайланд,** Бангкок). В’етнамскі музей этналогіі (В’етнам, Ханой). Музей генецыду «Туалсленгу» **(Камбоджа,** Пнампень)

## 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### 3.1. Тэматыка семінарскіх заняткаў

***Тэма 1.*** *Музеі краін Цэнтральнай Еўропы (4 гадзіны)*

1. Музеі Аўстрыі.
2. Музеі Чэхіі і Славакіі.
3. Музеі Швейцарыі.
4. Музеі Польшчы.
5. Музеі Балгарыі
6. Музеі інных краіны Цэнтральнай Еўропы.

***Літаратура.***


1. Бярэйшык, Л. У. Музеі замежных краін: Вучэбн. дапам. для студэнтаў гіст. фак. спец. 1-23 01 12 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». У 2 ч. Ч. 1.: Музеі Еўропы / Л. У. Бярэйшык, А. А. Гужалоўскі. – Мінск: БДУ, 2004. – С. 149 – 153.
2. Базельский художественный музей. Альбом. / Сост. и авт. текстов Т. Н. Букреев. – М.: Изобразительное искусство, 1987. – 196 с.
3. Всё о музеях мира. – СПб.: «СЗКЭО «Кристалл»», 2007. – 195 с.
4. Камин, Дж. Великие музеи мира / К. Камин. – М.: «Астрель», 2007. – 304 с.
5. Лысикова, О. В. Музеи мира : учебное пособие / О. В. Лысикова. — 5-е изд., стер. – Москва : ФЛИНТА, 2019. – С. 55-68. – [Электронны рэсурс] // Лань : электронно-библиотечная система. – Режим доступа: https://e.lanbook.com/book/122647. – Дата доступа: дата 03.05.2022.
6. Музей изобразительных искусств. Будапешт. Альбом. – М.: Изобр. искусство, 1976. – 209 с.
7. Национальный музей. Варшава. – М.: Изобразительное искусство, 1977. – 272 с.
8. 100 великих музеев мира / Автор–сост. И. А. Ионина. – М.: Вече, 2004 – 512 с.

9. Шереметьева, Т. Л. 100 музеев мира, которые необходимо увидеть / Т. Л. Шереметьева. – М.: Харвест, 2011. – 288 с.

10. Шмелёв, В.Г. Музеи под открытым небом: очерки возникновения и развития / В. Г. Шмелёв. – Киев: Наукова думка, 1983. – 119 с.

11. Шоймар, И. Венгерская национальная галерея / И. Шоймар. – Будапешт: Корвина. 1976. – 270 с.

12. Юренева, Т. Ю. Художественные музеи Западной Европы: История и коллекции : учебное пособие / Т. Ю. Юренева. — Москва : Академический Проект, 2020. – 414 с. – [Электронны рэсурс] // Лань : электронно-библиотечная система. – Режим доступа https://e.lanbook.com/book/132246. - Дата доступа: 04.05.2022.

***Тэма 2.*** *Музеі краін Усходняй Еўропы (4 гадзіны)*

1. Музеі Расіі.
2. Музеі Украіны
3. Музеі Эстоніі
4. Музеі Латвіі
5. Музеі Літвы

***Літаратура.***

1. Бярэйшык, Л. У. Музеі замежных краін: Вучэбн. дапам. для студэнтаў гіст. Фак. Спец. 1-23 01 12 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». У 2 ч. Ч. 1.: Музеі Еўропы / Л. У. Бярэйшык, А. А. Гужалоўскі. – Мінск: БДУ, 2004. – С. 149 – 153.

2. Всё о музеях мира. – СПб.: «СЗКЭО «Кристалл»», 2007. – 176 с.

3. Грицкевич, В. П. История музеев мира. Учебн. пособие для студентов ист. факт. / В. П. Грицкевич, А. А. Гужаловский. – Мінск: БГУ, 2003. – 284 с.

4. Камин, Дж. Великие музеи мира / К. Камин. – М.: «Астрель», 2007. – 304 с.

5. Лысикова, О. В. Музеи мира: Учебное пособие к интегрированному курсу «музеи мира» / О. В. Лысикова. – М.: Флинта: наука, 2002. – С. 55 – 69.
6. Музеи России. – М.: Мир энциклопедий, 2008. – 180 с.
7. Овчинникова, Б.Б. Из истории русских музеев: учебн. пособие / Б. Б. Овчинникова, Л. В. Чижова; Ураль. гос. ун-т им. А. М. Горького. – Екатеринбург: УрГУ. 1992. – 115 с.
8. 100 великих музеев мира / Автор–сост. И. А. Ионина. – М.: Вече, 2004 – 512 с.
9. Шмелёв, В.Г. Музеи под открытым небом: очерки возникновения и развития / В. Г. Шмелёв. – Киев: Наукова думка, 1983. – 119 с.

**Тэма 3. Музеі краін Паўночнай Амерыкі**

1. Музеі Канады
2. Музеі ЗША

***Літаратура.***

1. Бярэйшык, Л. У. Музеі замежных краін: Вучэбн. дапам. для студэнтаў гіст. фак. спец. 1-23 01 12 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». У 2 ч. Ч. 2.: Музеі Азіі, Амерыкі, Аўстраліі, Афрыкі / Л. У. Бярэйшык, А. А. Гужалоўскі. – Мінск: БДУ, 2008. – С. 86–127.
2. Всё о музеях мира. – СПб.: «СЗКЭО «Кристалл»», 2007. – 176 с.
3. Грицкевич, В. П. История музеев мира. Учебн. пособие для студентов ист. факт. / В. П. Грицкевич, А. А. Гужаловский. – Мінск: БГУ, 2003. – 284 с.
4. Камин, Дж. Великие музеи мира / К. Камин. – М.: «Астрель», 2007. – 304 с.

**Тэма 4. Музеі краін Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыкі**

1. Музеі Мексікі
2. Музеі Кубы.
3. Музеі Бразіліі.
4. Музеі Аргенціны.

5. Музеі іншых краін Паўднёвай Амерыкі.

***Літаратура.***

1. Бярэйшык, Л. У. Музеі замежных краін: Вучэбн. дапам. для студэнтаў гіст. фак. спец. 1-23 01 12 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». У 2 ч. Ч. 2.: Музеі Азіі, Амерыкі, Аўстраліі, Афрыкі / Л. У. Бярэйшык, А. А. Гужалоўскі. – Мінск: БДУ, 2008. – С. 128–156.
2. Всё о музеях мира. – СПб.: «СЗКЭО «Кристалл»», 2007. – 176 с.
3. Грицкевич, В. П. История музеев мира. Учебн. пособие для студентов ист. факт. / В. П. Грицкевич, А. А. Гужаловский. – Мн.: БГУ, 2003. – 284 с.
4. Камин, Дж. Великие музеи мира / К. Камин. – М.: «Астрель», 2007. – 304 с.

**Тэма 5. Музеі краін Паўночнай Афрыкі**

1. Музеі Егіпта.
2. Музеі Алжыра і Лівіі.

***Літаратура.***

1. Бярэйшык, Л. У. Музеі замежных краін: Вучэбн. дапам. для студэнтаў гіст. фак. спец. 1-23 01 12 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». У 2 ч. Ч. 2.: Музеі Азіі, Амерыкі, Аўстраліі, Афрыкі / Л. У. Бярэйшык, А. А. Гужалоўскі. – Мінск: БДУ, 2008. – С. 173–178.
2. Всё о музеях мира. – СПб.: «СЗКЭО «Кристалл»», 2007. – 176 с.

**Тэма 5. Музеі краін Цэнтральнай і Паўднёвай Афрыкі**

**1.** Музеі Нігерыі.
**2.** Музеі Кеніі.
**3.** Музеі Судана.
**4.** Музеі ПАР (Паўднёва-афрыканская рэспубліка).

***Літаратура.***

1. Бярэйшык, Л. У. Музеі замежных краін: Вучэбн. дапам. для студэнтаў гіст. фак. спец. 1-23 01 12 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». У 2 ч. Ч. 2.: Музеі Азіі, Амерыкі, Аўстраліі, Афрыкі / Л. У. Бярэйшык, А. А. Гужалоўскі. – Мінск: БДУ, 2008. – С. 178–195.
2. Юренева, Т. Ю. Музееведение: Учебн. для высшей школы / Т. Ю. Юренева. – М.: Академический проект, 2003. – 560 с. («Gaudeamus»).

# 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## 4.1. Заданні для самастойнай работы студэнтаў

1. Музеі Аўстраліі
2. Музеі Новай Зеландыі і Акеаніі.
3. Музеі Пярэдняй (Заходняй) Азіі.
4. Музеі Усходняй Азіі.
5. Музеі Паўднёвай Азіі.
6. Музеі Паўднёва-Усходняй Азіі.

**Літаратура.**


1. Бярэйшык, Л. У. Музеі замежных краін: Вучэбн. дапам. для студэнтаў гіст. фак. спец. 1-23 01 12 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». У 2 ч. Ч. 2.: Музеі Азіі, Амерыкі, Аўстраліі, Афрыкі / Л. У. Бярэйшык, А. А. Гужалоўскі. – Мінск: БДУ, 2008. – 247 с.
2. Грицкевич, В. П. История музеев мира. Учебн. пособия для студентов ист. фак. / В. П. Грицкевич, А. А. Гужаловский. – Мн.: БГУ, 2003. – 284 с.: илл.
3. Камин, Дж. Великие музеи мира / К. Камин. – М.: «Астрель», 2007. – 304 с.
4. Лысикова, О. В. Музеи мира: Учебное пособие к интегрированному курсу «музеи мира» / О. В. Лысикова. – М.: Флинта: наука, 2002. – С. 45 – 46, 69 – 86.
5. Ревякин, В. И. Музеи мира: Франция. Италия. Иран. США. Япония. Германия. Дания. Норвегия. Великобритания. Швеция. Куба. Финляндия. Колумбия. Бразилия. Мексика. Архитектура / В. В. Ревякин. – М.: Інформэкспресс, 1993. – 244 с.
6. 100 великих музеев мира / Автор-сост. И. А. Ионина. – М.: Вече, 2004 – 512 с.
7. Хадсон, К. Влиятельные музеи / К. Хадсон; Пер. с англ. Л. Мотылева. – Новосибирск: Науч.-изд. центр «Сиб. хронограф», 2001. – 194 с.
8. Юренева, Т. Ю. Музей в мировой культуре / Т. Ю. Юренева. – М.: Русское слово – РС, 2003. – С. 255-314.

## 4.2. Пытанні да экзамену

1. Дзейнасць ЮНЕСКА ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны і музейнай справы.
2. Гісторыя стварэння і дзейнасці ICOM.
3. Дзейнасць міжнародных няўрадавых арганізацый (Еўрасаюз і Савет Еўропы) па пытаннях музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай справы.
4. Арганізацыя музейнай справы ў Германіі.
5. Гісторыя фарміравання і асаблівасці калекцый музеяў у Германіі.
6. Прынцыпы арганізацыі музейнай справы ў Францыі.
7. Гісторыя фарміравання і асаблівасці калекцый і музеяў у Францыі.
8. Арганізацыя музейнай справы ў Велікабрытаніі.
9. Характарыстыка музеяў у Англіі.
10. Характарыстыка музеяў у Шатландыі.
11. Гісторыя стварэння і характарыстыка калекцый музеяў у Грэцыі.
12. Арганізацыя музейнай справы ў Італіі.
13. Гісторыя стварэння і характарыстыка калекцый музеяў у Італіі.
14. Агульная характарыстыка стану і арганізацыі музейнай справы ў Іспаніі.
15. Гісторыя фарміравання і асаблівасці калекцый у музеях Іспаніі.
16. Асноўныя тэндэнцыі развіцця музейнай справы ў Нідэрландах. Характарыстыка буйнейшых музеяў.
17. Характарыстыка буйнейшых музеяў і калекцый Бельгіі.
18. Арганізацыя музейнай справы і характарыстыка буйнешых музеяў у Даніі.
19. Характарыстыка буйнейшых музеяў у Нарвегіі.
20. Характарыстыка буйнейшых музеяў у Швецыі.
21. Характарыстыка буйнейшых музеяў у Фінляндыі.
22. Характарыстыка музеяў і стан музейнай справы ў Расіі.
23. Характарыстыка бунейшых музеяў у Чэхіі.
24. Характарыстыка буйнешых музеяў у Аўстрыі і Швейцарыі.
25. Характарыстыка бунейшых музеяў і стан музейнай справы ў Польшы.
26. Характарыстыка буйнейшых музеяў Балгарыі.

27. Характарыстыка буйнейшых музеяў Украіны.
28. Характарыстыка буйнейшых музеяў Літвы, Латвіі і Эстоніі.
29. Характарыстыка буйнейшых музеяў Канады.
30. Характарыстыка буйнейшых музеяў ЗША.
31. Характарыстыка буйнейшых музеяў Мексікі і Кубы.
32. Характарыстыка буйнейшых музеяў Бразіліі і Аргенціны.
33. Характарыстыка буйнейшых музеяў Венесуэлы, Чылі і Калумбіі.
34. Характарыстыка музеяў Егіпта і Алжыра.
35. Характарыстыка музеяў Лівіі і Туніса.
36. Характарыстыка музеяў Нігерыі, Кеніі і Судана.
37. Характарыстыка музеяў Паўднёва-Афрыканскай рэспублікі.
38. Музеі Аўстраліі. Асноўныя тэндэнцыі развіцця і фарміравання калекцый.
39. Характарыстыка буйнейшых музеяў Новай Зеландыі і краін Акіяніі.
40. Характарыстыка буйнейшых музеяў Ізраіля.
41. Музеі Турцыі. Асноўныя тэндэнцыі развіцця музеяў і музейнай справы.
42. Музеі Ірана, Іракa і Афганістана. Асноўныя тэндэнцыі развіцця і фарміравання калекцый.
43. Музеі Лівана і Сірыі. Асноўныя тэндэнцыі развіцця і фарміравання калекцый.
44. Музеі Кітая. Асноўныя тэндэнцыі развіцця і фарміравання калекцый.
45. Музеі Японіі. Асноўныя тэндэнцыі развіцця і фарміравання калекцый.
46. Музеі Паўночнай і Паўднёвай Карэі. Асноўныя тэндэнцыі развіцця і фарміравання калекцый.
47. Музеі Індыі. Асноўныя тэндэнцыі развіцця і фарміравання калекцый.
48. Музеі Пакістана. Асноўныя тэндэнцыі развіцця і фарміравання калекцый.
49. Музеі Сінгапура, Ганконга, Інданэзіі, Філіпін.
50. Музеі В’етнама, Камбоджы і Тайланда.

## 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1. ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назвы раздзелаў, тэмы | Колькасць аўдыторных адзін | | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінар. заняткі | Колькасць гадзін КРС | |
| Уводзіны | 0.5 | | | |
| **Раздзел I. Міжнародныя арганізацыі і аб'яднанні ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны** | | | | |
| **Тэма 1.** Дзейнасць ЮНЕСКА ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны | 1.5 | | | |
| **Тэма 2.** Дзейнасць Міжнароднага савета музеяў (ICOM) | 2 | | | |
| **Тэма 3.** Праца Еўрапейскага саюза і Савета Еўропы па пытаннях музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны | 2 | | | |
| **Раздзел II. Музеі Еўропы** | | | | |
| **Тэма 4**. Музеі Велікабрытаніі | 2 | | | |
| **Тэма 5.** Музеі Францыі | 2 | | | |
| **Тэма 6.** Музеі Германіі | 2 | | | |
| **Тэма 7.** Музеі Італіі | 2 | | | |
| **Тэма 8.** Музеі Іспаніі | 2 | | | |
| **Тэма 9**. Музеі Грэцыі | 2 | | | |
| **Тэма 10.** Музеі Нідэрландаў і Бельгіі | 2 | | | |
| **Тэма 11.** Музеі краін Скандынавіі (Нарвегія, Швецыя, Фінляндыя, Данія) | 4 | | | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Тэма 12.** Музеі краін Цэнтральнай Еўропы | | 4 | | |
| **Тэма 13.** Музеі краін Усходняй Еўропы | | 4 | | |
| **Раздзел III. Музеі Амерыкі** | | | | |
| **Тэма 14.** Музеі краін Паўночнай Амерыкі | | 2 | | |
| **Тэма 15.** Музеі краін Лацінскай і Паўднёвай Амерыкі | | 2 | | |
| **Раздзел IV. Музеі Афрыкі** | | | | |
| **Тэма 16.** Музеі Паўночнай Афрыкі | | 2 | | |
| **Тэма 17.** Музеі Цэнтральнай і Паўднёвай Афрыкі | | 2 | | |
| **Раздзел VI. Музеі Аўстраліі** | | | | |
| **Тэма 18.** Музеі Аўстраліі, Новай Зеландыі і краін Акіяніі | | | 4 | Падрыхтоўка і праверка электроннай прэзентацыі |
| **Раздзел VII. Музеі Азіі** | | | | |
| **Тэма 19.** Музеі Пярэдняй (Заходняй) Азіі | | | 2 | Падрыхтоўка і праверка электроннай прэзентацыі |
| **Тэма 20.** Музеі Усходняй Азіі | | | 2 | Падрыхтоўка і праверка электроннай прэзентацыі |
| **Тэма 21.** Музеі Паўднёвай Азіі | | | 2 | Падрыхтоўка і праверка электроннай прэзентацыі |
| **Тэма 22.** Музеі Паўднёва-Усходняй Азіі | | | 2 | Падрыхтоўка і праверка электроннай прэзентацыі |
| **Разам …** | 24 | 16 | 12 | |

## 5.2 Асноўная літаратура


1. *Бярэйшык, Л. У.* Музеі замежных краін: Вучэбн. дапам. для студэнтаў гіст. фак. спец. 1-23 01 12 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». У 2 ч. Ч. 2.: Музеі Азіі, Амерыкі, Аўстраліі, Афрыкі / Л. У. Бярэйшык, А. А. Гужалоўскі. – Мінск: БДУ, 2008. – 247 с.
2. *Грицкевич, В. П.* История музеев мира. Учебн. пособия для студентов ист. факт. / В. П. Грицкевич, А. А. Гужаловский. – Мн.: БГУ, 2003. – 284 с.


## 5.3. Дадатковая літаратура


1. *Бярэйшык, Л. У.* Музеі замежных краін: Вучэбн. дапам. для студэнтаў гіст. фак. спец. 1-23 01 12 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». У 2 ч. Ч. 1.: Музеі Еўропы / Л. У. Бярэйшык, А. А. Гужалоўскі. – Мінск: БДУ, 2004. – 188 с.
2. *Всё* о музеях мира. – СПб.: «СЗКЭО «Кристалл»», 2007. – 176 с.
3. *Камин, Дж.* Великие музеи мира / Дж. Камин. – Тверь: АСТ, 2007. – 304 с.
4. *Лысикова, О. В.* Музеи мира : учебное пособие / О. В. Лысикова. — 5-е изд., стер. – Москва : ФЛИНТА, 2019. – С. 41-119. – [Электронны рэсурс] // Лань : электронно-библиотечная система. – Режим доступа: https://e.lanbook.com/book/122647. – Дата доступа: дата 03.05.2022.
5. *Овчинникова, Б.Б.* Из истории русских музеев: учебн. пособие / Б. Б. Овчинникова, Л. В. Чижова; Ураль. гос. ун-т им. А. М. Горького. – Екатеринбург: УрГУ. 1992. – 115 с.
6. *Низовский, А. Ю.* Велишайшие музеи мира / А. Ю. Низовский. – М.: Вече, 2008. – 400 с.
7. *Ревякин, В. И.* Музеи мира: Франция. Италия. Иран. США. Япония. Германия. Дания. Норвегия. Великобритания. Швеция. Куба. Финляндия. Колумбия. Бразилия. Мексика. Архитектура / В. В. Ревякин. – М.: Інформэкспресс, 1993. – 244 с.

8. *Хадсон, К.* Влиятельные музеи / К. Хадсон; Пер. с англ. Л. Мотылева. – Новосибирск: Науч.-изд. центр «Сиб. хронограф», 2001. – 194 с.

9. Юренева, Т. Ю. Музеи мира: история и коллекции, шедевры и раритеты / Т. Ю. Юренева. – М.: Академический проект, 2011. – 560 с. («Gaudeamus»).

10. *Юренева, Т. Ю.* Музей в мировой культуре / Т. Ю. Юренева. – М.: Русское слово – РС, 2003. – С. 255-314.

11. *Юренева, Т. Ю.* Художественные музеи Западной Европы: История и коллекции : учебное пособие / Т. Ю. Юренева. — Москва : Академический Проект, 2020. – 414 с. – [Электронны рэсурс] // Лань : электронно-библиотечная система. – Режим доступа https://e.lanbook.com/book/132246. - Дата доступа: 04.05.2022.